# АЛЕКСАНДРОВІЧ ЮРЫЙ МІХАЙЛАВІЧ



Нямногія вярнуліся з той крывавай і страшнай вайны жывымі, каб праз шмат гадоў вучыць маладое пакаленне мужнасці і нязломнасці, высокаму грамадзянскаму абавязку. На Астравеччыне ў год святкавання 75-годдзя Перамогі ў жывых застаўся ўсяго адзін ветэран – Александровіч Юрый Міхайлавіч, якому ўжо 94 гады. Ён прайшоў нялёгкі ваенны шлях, радуючыся кожнай хвілінцы спакою, цішы і міру.

Юрый Міхайлавіч нарадзіўся 24.04.1926г. у сям'і хлебаробаў на хутары Газа. У сям'і было шасцёра дзяцей, бацька ў 45 гадоў захварэў запаленнем і памёр, пакінуўшы жонку і дзяцей у беднасці і нястачы. Юрый, калі крыху падрос, пайшоў служыць у людзі, каб сям'я не жабравала.

Вучыцца не давялося – не да навукі было дзецям: пачалася вайна. Прыгажуна хлопца ў 18 гадоў у 1944 годзе прызвалі на Вялікую Айчынную вайну. Падвучылі крыху ваеннай справе, а потым адправілі на фронт у армію імя Т. Касцюшкі ў полк №2 стралком-аўтаматчыкам. Так беларускі хлопец вызваляў Варшаву, але атрымаў раненне і трапіў у шпіталь. Падлячылі – і зноў на фронт, на перадавую.

У паўсотні кіламетрах ад Берліна ў час наступлення яго засыпала зямлёй ад разрыва снарада. Юрый не памятаў, што з ім было далей. Ачуняў ужо ў бальніцы: кантузія. Там жа ён дазнаўся пра перамогу. Што рабілася тады ў бальніцы! Усе плакалі і смяяліся, абдымаліся і зноў плакалі ад радасці.

Хутка Юрый Міхайлавіч паправіўся (перамагла маладосць) і адправіўся ў свой полк, дзе служыў санітарам. Толькі восенню 1946 года яго камісавалі.

Салдат вярнуўся да мірнай працы на сваю радзіму, ажаніўся, нарадзіліся двое дзетак – сын і дачка. Спакой і любоў у сям'і, мірная праца на зямлі паціху рабілі сваю справу: вайна з яе жахамі адступала, сціраліся вобразы людзей, з якімі ён дзяліў салдацкія будні, твары салдат, якіх яму давялося хаваць у брацкіх магілах. Ды час ад часу сніўся салдату адзін і той жа сон: з аўтаматам у руках ён некуды бяжыць, а яму ў твар цэліцца фашыст – і Юрый нават бачыць яго скрыўлены ў ярасці твар. Сэрца пачынала шалёна калаціцца, хацелася крычаць – і з тым ён прачынаўся.



Самастойна Юрый навучыўся цяслярскай справе. Будаваў і шаляваў хаты, вёў гаспадарку, затым працаваў у калгасе. Падраслі дзеці, завялі свае сем'і, усё паціху абсталявалася.

Пакуль моцны і здаровы, ён не адчувае сваіх гадоў. Як воін – франтавік, Юрый Міхайлавіч часта наведваўся ў суседнія школы да дзяцей, бываў на сустрэчах з такімі ж ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Прыходзілі і да яго школьнікі, слухалі цікавыя аповяды аб жыцці-быцці. Рыхтуючыся да такіх сустрэч, ён апранаў свой ваенны кіцель, цяжкі ад медалёў. Зверху над імі ордэн "Вялікай Айчыннай вайны II ступені" і медаль Г. Жукава – гэта, як жартуе ветэран, для большай важнасці.

Юрый Александровіч шчыры, вясёлы і адкрыты чалавек, для якога патрыятызм – не проста слова, але лад і жыцця. Ён прырос, прыкіпеў да сваёй вёскі Фальваркі Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці, дзе і людзі, і паветра – родныя. Ён і сёння актыўны ўдзельнік усіх раённых мерапрыемстваў: прыходзіць на мітынгі, сустракаецца са школьнікамі і з ваеннаслужачымі, удзельнічае ў рытуалах прыняцця прысягі ў вайсковых часцях, якія базіруюцца ў раёне.

І гэтак хочацца былому салдату, каб яго дзеці, унукі і ўсе наступныя пакаленні жылі ў міры, працы, разуменні і шчасці, каб больш не гінулі людзі і не рваліся снарады.







Материалы предоставил
Ярошевич Дмитрий Юрьевич
ИПФ, группа 10903217

Белорусский национальный технический университет

Управление по воспитательной работе с молодежью

Выставка "История Великой Отечественной войны в лицах"

Д. Ю. Ярошевич

# АЛЕКСАНДРОВІЧ ЮРЫЙ МІХАЙЛАВІЧ

Минск БНТУ 2020